# СЕКЦИЯ ЯЗЫКОЗНАНИЯ

УДК 821.161.3

## СІНТАКСІЧНЫЯ СРОДКІ ВЫРАЗНАСЦІ Ў ДРАМАТУРГІІ СЯРГЕЯ КАВАЛЕВА

***Л.А. Данева*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***А.М. Шубадзёрава***,
канд. філал. навук, дацэнт

Сяргей Кавалёў – вядомы беларускі драматург, крытык, літаратуразнаўца. Аснову яго творчасці складаюць драматургічныя творы на гістарычную тэматыку. Сяргей Кавалеў аўтар такіх п’ес, як «Сестры Псіхеі», «Трышчан ды Іжота», «Стомлены д’ябал» і інш [1]. Прадметам даследавання сталі такія сінтаксічныя сродкі выразнасці, як рытарычныя звароты, пытанні, воклічы, якія С. Кавалёў часта выкарыстоўвае ў сваіх творах.

Рытарычнае пытанне – фігура маўлення ў форме запыту, сутнасць якой у тым, што пытанне ставіцца не з мэтай атрымаць адказ ад чытача ці суразмоўцы, а каб максімальна акцэнтаваць увагу на з’яве, падзеі, факце або ўвогуле на тэме прамовы: *«Хіба чалавеку дадзена быць гаспадаром уласнага лесу?»* У С. Кавалёва рытарычныя пытанні найчасцей выкарыстоўваюцца ў форме простага поўнага развітага або неразвітага сказа, напрыклад: «*Што за д’ябальскія жарты?!, Чуеце?, І што яна цяпер зробіць?*» [1]

Рытарычны зварот – рытарычная фігура, сутнасць якой у эмацыйным звароце да нерэальных субяседнікаў з мэтай узмацнення выразнасці маўлення: *«Ен зноў насмяяўся з мяне… коштам твайго жыцця насмяяўся, Іжота!»* Нерэальнымі субяседнікамі звычайна выступаюць чытач, Бог, месца, неадушаўленая асоба, прадмет, з’ява прыроды ці інш.: *«Хай Тартар возьме гэтую брудную душыцу!»*

Рытарычны вокліч – фігура маўлення, якая змяшчае ў сабе эмацыянальна-ўзнеслую рэакцыю аўтара, яго непасрэдны водгук на якую-небудзь з’яву ці падзею: *«Кароль Жыгімонт Аўгуст, апошні з Ягелонаў пакінуў свет!».*

Названыя вышэй сінтаксічныя фігуры надаюць твору асаблівую экспрэсіўнасць, пранікнёнасць, выклікаюць у чытача жывы водгук на тое, пра што гаворыць пісьменнік, надаюць твору атмасферу таямнічасці, прысутнасці на сцэне, акрамя асноўных дзейных асоб, нечага невядомага, нябачнага, незвычайнага.

**Літаратура**

1. **Кавалеў, С.** П’есы / С. Кавалёў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2011. – 220 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова